# СКЛАД УЧАСТКОВЫХ ВЫБАРЧЫХ КАМІСІЙ

АДЗІНЫ ДЗЕНЬ ГАЛАСАВАННЯ

**ДЛЯ ПРАВЯДЗЕННЯ ВЫБАРАЎ У АДЗІНЫ ДЗЕНЬ ГАЛАСАВАННЯ 25 ЛЮТАГА 2024 ГОДА Ў БЕЛАРУСІ СФАРМІРАВАНА 5411 УЧАСТКОВЫХ ВЫБАРЧЫХ КАМІСІЙ, У СКЛАД ЯКІХ УВАЙШЛІ 57 233 ЧАЛАВЕКІ**




Інфаграфіка ЦВК Беларусі

# МІНЧАНАМ — ПА ДВА, ВЯСКОЎЦАМ — ПА ЧАТЫРЬ

## Чым адметны адзіны дзень галасавання

**Учора завяршылася рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты. Пачынаецца самы цікавы перыяд у выбарчай кампаніі — перыяд агітацыі. Ён будзе доўжыцца да 24 лютага.**

Адзіны дзень галасавання адбудзецца 25 лютага. З 20 да 24 лютага тыя грамадзяне, у якіх па нейкіх прычынах не атрымліваецца прыйсці на ўчастак у асноўны дзень, могуць прагаласаваць датэрмінова. Калі выбаршчык па стане здароўя альбо па іншых уважлівых прычынах не можа прыйсці ў дзень выбараў у памяшканне для галасавання, ён можа запрасіць членаў участковай камісіі да сябе дадому. Аб жаданні прагаласаваць дома трэба паведаміць ва ўчастковую камісію ў любы час, а ў дзень выбараў — да 18 гадзін. Майце на ўвазе, што галасаванне дома магчыма толькі непасрэдна 25 лютага.

Гэтым разам колькасць бюлетэняў, якія атрымае выбаршчык, залежыць ад месца яго пражывання: жыхары сталіцы будуць выбіраць дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і дэпутатаў Мінгарсавета — ім належыць запоўніць два бюлетэні. Тыя, хто жыве ў абласным горадзе або райцэнтры, атрымаюць тры бюлетэні — ім трэба будзе выбраць дэпутата Палаты прадстаўнікоў, дэпутата аблсавета, дэпутата раённага (або гар-) савета. Найбольшую колькасць бюлетэняў атрымаюць вяскоўцы — акрамя ўсіх пералічаных, яны яшчэ будуць выбіраць і дэпутатаў сельсавета, а гэта ўжо чацвёрты бюлетэнь.

Выбары, якія праводзяцца такім чынам, — калі ў адзін дзень выбіраюць прадстаўнікоў заканадаўчай улады ўсіх узроўняў, — першыя ў гісторыі незалежнай Беларусі. Гэта яшчэ адна важкая прычына паўдзельнічаць у сапраўды гістарычнай падзеі.